Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 6 (629) Пятніца, 25 лютага 1966 года Год выдання XIX. Цана 1 кап.

**19 лютага 1966 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. Пленум ЦК КПСС абмеркаваў праект Дырэктыў XXIII з'езда КПСС па пяцігадоваму плану развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1966—1970 гады.**

**Пленум ЦК КПСС заслухаў па гэтаму пытанню паведамленне Старшыні Савета Міністраў СССР тав. А. М. Касыгіна.**

**У спрэчках выступілі: тт. П. Я. Шэлест—першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, Д. А. Кунаеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана, М. Р. Ягорычаў — першы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, З. Н. Нурыеў — першы сакратар Башкірскага абкома КПСС, Ц. Я. Кісялёў — Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР, Г. І. Папоў — першы сакратар Ленінградскага гаркома КПСС, М. С. Саломенцаў — першы сакратар Растоўскага абкома КПСС.**

**На Пленуме выступіў першы сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.**

**Пленум прыняў адпаведную пастанову.**

## ЗВАННЕ КАМУНІСТА АБАВЯЗВАЕ

*(З даклада тав. І. П. ЗЯЦЬКОВА на агульным партыйным сходзе камуністаў — студэнтаў універсітэта «Аб выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі 1965/1966 навучальнага года»).*

**Наш універсітэт рыхтуе вялікую армію спецыялістаў для многіх галін вытворчасці, навукі, працы ў школах не толькі нашай рэспублікі, але і ўсяго Савецкага Саюза. Патрэба ў высокакваліфікаваных спецыялістах для народнай гаспадаркі штогод узрастае. Таму кантынгент набору студэнтаў ва універсітэт будзе з кожным годам павялічвацца. Праз тры-чатыры гады ва універсітэце толькі на стацыянары будзе займацца каля дзесяці тысяч студэнтаў. Значна пашырыцца і матэрыяльна-тэхнічная база універсітэта. Мы сёння самі з'яўляемся жывымі сведкамі таго, як хутка ідзе будаўніцтва новых карпусоў і лабараторый. Разам з тым адкрыюцца новыя кафедры, усё новыя профілі спецыялізацыі асвайваюць факультэты. Наша Партыя, дзяржава сапраўды праяўляюць вялікія клопаты аб развіцці адной з самых буйных навучальных устаноў рэспублікі.**

**Клопаты Партыі і Урада многаму абавязваюць увесь прафесарска-выкладчыцкі калектыў і ўсіх студэнтаў, у першую чаргу камуністаў. Наш галоўны абавязак — падрыхтоўка спецыялістаў высокай кваліфікацыі, маральна вытрыманых і ідэйна загартаваных. Нельга не адзначыць такі факт, што некаторыя маладыя спецыялісты, — праўда, іх адзінкі, — пасля заканчэння вну ў выніку сваёй слабай тэарэтычнай і практычнай прафесійнай падрыхтоўкі не спраўляюцца з працай на вытворчасці. Нашы прадпрыемствы зараз узброены самымі новымі дасягненнямі навукі і тэхнікі. Пасрэдныя спецыялісты там, вядома, не патрэбны. Гэта абавязвае нас настойліва працаваць над павышэннем свайго навуковага ўзроўню, ніколі не адставаць ад жыцця.**

**Рэктарат, партыйны камітэт нашага універсітэта звяртаюць самую сур'ёзную ўвагу прафесарска-выкладчыцкіх кадраў, а таксама студэнцкага калектыву — у першую чаргу камуністаў — на вырашэнне адказных задач, што стаяць перад універсітэтам.**

**Якасць падрыхтоўкі спецыялістаў перш за ўсё залежыць ад узроўню выкладання. Вядучай фігурай у вышэйшай навучальнай установе з'яўляецца прафесар, выкладчык. На ім у першую чаргу ляжыць адказнасць за глыбокія веды студэнта. Ад выкладчыкаў, ад іх навуковага і палітычнага ўзроўню залежыць ідэйна-навуковы ўзровень выкладання і якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. Прафесары, выкладчыкі ў сваёй паўсядзённай дзейнасці павінны не толькі на высокім навуковым узроўні выкладаць свой прадмет, але і ўсебакова садзейнічаць фарміраванню камуністычнага светапогляду ў студэнтаў, выхоўваць у іх гарачую любоў да сваёй прафесіі і высокія маральныя якасці. Іменна пагэтаму рэктарат і партыйны камітэт універсітэта вялікую ўвагу ўдзяляюць рабоце з выкладчыцкімі кадрамі, іх навуковаму і палітычнаму росту, павышэнню іх навуковай кваліфікацыі. Значная частка выкладчыкаў універсітэта заканчвае дактарантуру, якая арганізавана пры універсітэце. Паўсядзённыя клопаты аб павышэнні навуковай кваліфікацыі выкладчыкаў прыводзяць да таго, што якасць і навуковы ўзровень дысертацый значна павышаецца. У 1965 годзе колькасць выкладчыкаў, абараніўшых доктарскія і кандыдацкія дысертацыі, значна большая ва універсітэце, чым ва ўсіх іншых вну рэспублікі разам узятых. Пытанні росту выкладчыцкага калектыву нядаўна зноў абмяркоўваліся на агульнауніверсітэцкай нарадзе выкладчыкаў.**

**Але было б памылкова думаць, што толькі ад выкладчыцкага калектыву залежыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Галоўнае залежыць ад тых, хто непасрэдна набывае тую ці іншую кваліфікацыю — ад саміх студэнтаў. У сваёй рабоце з імі партыйная арганізацыя універсітэта ў першую чаргу абапіраецца на авангард студэнцкай моладзі — на камуністаў.**

**Аднак, дэканаты, партыйныя арганізацыі факультэтаў яшчэ далёка не выкарыстоўваюць усе магчымасці партгруп і камсамольскіх арганізацый курсаў у барацьбе за вучобу і дысцыпліну студэнтаў. Многія студэнты-камуністы самі не з'яўляюцца прыкладам у вучобе, а некаторыя займаюцца нават і горш, чым беспартыйныя студэнты. Ёсць і такія камуністы, якія вучацца на «добра» і «выдатна», але сваёй паспяховасцю не садзейнічаюць вучобе ўсёй групы, не «падцягваюць» адстаючых студэнтаў, не іграюць таксама авангарднай ролі у грамадскім жыцці.**

**А вынікі мінулай сесіі далёка не могуць задаволіць нас. На хімічным, геаграфічным, а таксама на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта сярод камуністаў толькі па аднаму выдатніку. Лепшыя поспехі ў камуністаў юрфака. На факультэце здало сесію сто два камуністы, з іх толькі на «выдатна» дваццаць два, на «выдатна» і «добра» — пяцьдзесят два, дваццаць восем— на «здавальняюча» і «добра» і толькі дванаццаць маюць «нездавальняючыя» адзнакі. На матэматычным факультэце трынаццаць камуністаў. На «выдатна» здало сесію чатыры, на «выдатна» і «добра» — чатыры, астатнія — на «добра» і «здавальняюча». Толькі на гэтым факультэце сярод камуністаў няма двоечнікаў. Слабыя веды на экзаменах паказалі ў гэтым годзе камуністы-студэнты аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта. Тут толькі два выдатнікі.**

**Як прыкры факт трэба адзначыць, што два камуністы не з'явіліся на экзамены наогул, прычым па няўважлівых прычынах.**

**Каб больш наглядна паказаць, як камуністы універсітэта здалі зімовую сесію — звернемся да такіх фактаў. Ва універсітэце толькі пяцьдзесят тры камуністы — выдатнікі, сто пяцьдзесят чатыры вучацца на «выдатна» і «добра», сто дваццаць адзін на «здавальняюча», астатнія трыццаць — на «нездавальняюча». Трыццаць «нездавальняючых» адзнак сярод камуністаў! Гэта лічба паўсядзённа напамінае нам аб нашых недахопах!**

**З кароткага аналізу вынікаў сесіі сярод камуністаў відаць, што большасць з іх паспяхова авалод-**

**(Заканчэнне на 2-й стар.).**

## ПАДВОДЗЯЦЦА ВЫНІКІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ

21 ЛЮТАГА гэтага года адкрылася канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага складу нашага універсітэта, прысвечаная вынікам навукова-даследчай работы ў 1965 годзе. На ёй выступіў рэктар акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка, даклад «Вынікі навукова-даследчай работы ў 1965 годзе» зрабіў прарэктар па навуковай рабоце прафесар В. І. Сцяпанаў.

За справаздачны перыяд шэсць чалавек абаранілі доктарскія дысертацыі і дваццаць дзевяць — кандыдацкія. Выйшла з друку 633 працы, з якіх—дзесяць манаграфій, дваццаць адзін падручнік і вучэбна-метадычны дапаможнік, 600 брашур і артыкулаў.

Найбольш буйнымі і каштоўнымі навуковымі працамі з'яўляюцца Г. Г. Вінберга «Мінеральныя ўгнаенні ставаў», А. Н. Іпацьева «Селекцыя пладовых раслін», М. М. Паўлючэнкі і іншых «Гетарагенныя хімічныя рэакцыі», В. М. Сікорскага «Сусветны рэвалюцыйны працэс і сучасны сацыял-рэфармізм», І. М. Лушчыцкага і іншых. «Асновы марксісцка-ленінскай этыкі» і «Асновы навуковага атэізма», М. І. Крукоўскага «Логіка прыгажосці», М. І. Жыркевіча «Падручнік беларускай мовы», В. А. Пыжкова «Газета і сучаснасць».

Канферэнцыя працягвае сваю работу. На секцыях па розных галінах—фізічных, матэматычных, біялагічных, хімічных, геаграфічных, грамадскіх і іншых навук заслухоўваюцца і абмяркоўваюцца многія змястоўныя і цікавыя даклады.

**І. ШПАДАРУК.**

## ЗОРКА ГЕРОЯ

*Вайна застала Аляксандра Андрэевіча Філімонава на студэнцкай практыцы. Студэнтам прыйшоў ён у баявыя шарэнгі Савецкай Арміі, адкуль яго накіравалі на вучобу ў танкавае вучылішча, а затым — на фронт. Цяжкі і вялікі шлях баявога камандзіра-танкіста прайшоў сённяшні дацэнт універсітэта. Любяць пагутарыць з ім савецкія і замежныя студэнты. А яму ёсць пра што расказаць.*

*Вось і цяпер, на святкаванні дня Савецкай Арміі, сабраліся студэнты з Кубы і краін Афрыкі на сустрэчу з былым танкістам. Слухаюць яго ўважліва і Чама Юсуф з Самалі, і Сальвадор Насія з «партугальскай» Гвінеі, і Альберта Касіма з Мазамбіка, і Аджэй Амаанінг з Ганы, студэнты з Кубы, Кеніі, Паўднёва-Афрыканскай рэспублікі.*

*За ўдзел у баях на Курскай дузе Аляксандр Андрэевіч быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II-ой ступені, а пад Берлінам — ён стаў Героем Савецкага Саюза. Закончыў вайну Аляксандр Андрэевіч у сталіцы Чэхаславакіі Празе.*

*Пасля вайны Аляксандр Андрэевіч закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна, аспірантуру, паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Зараз працуе дацэнтам ва універсітэце, падрыхтаваў і здаў у друк манаграфію па доктарскай дысертацыі «Камуністычная партыя Беларусі ў барацьбе за ўмацаванне саюза рабочага класа і працоўнага сялянства ў перыяд суцэльнай калектывізацыі ў 1929—1936 гады».*

*Мы жадаем яму поспехаў у рабоце. У сваім жыцці мы будзем кіравацца яго прыкладам, прыкладам сапраўднага прадстаўніка старэйшага пакалення савецкіх людзей.*

*Грыгорыо Дарыяс (Куба),*
*Абдулкадзір Магамет Нур (Самалі),*
*студэнты падрыхтоўчага факультэта.*

## Народны кантроль на хімфаку

### ПАЎСЯДЗЁННУЮ ЎВАГУ АСПІРАНТАМ

ГРУПА НАРОДНАГА кантролю хімічнага факультэта ў складзе В. П. Мардыкіна, Г. А. Лазерка, Л. І. Савасцьянавай, Е. І. Продан і П. А. Клімоўскага зрабіла праверку падрыхтоўкі аспірантаў на факультэце.

Народныя кантралёры выявілі, што навуковыя праблемы, над якімі працуюць аспіранты, маюць важнае практычнае значэнне для хімічнай прамысловасці. У дысертантаў ёсць шмат даследаванняў, прапаноў, накіраваных на развіццё хіміі ў нашай краіне. Над дысертацыямі аспіранты працуюць старанна, з жаданнем даследаваць выбраную тэму на высокім навуковым узроўні і ў тэрмін. Асабліва добра ідуць справы па неарганічнай і аналітычнай хіміі, дзе кіраўнікамі з'яўляюцца прафесар Г. А. Старобінец і дацэнт В. В. Свірыдаў.

Аднак з падрыхтоўкай аспірантаў на факультэце не ўсё добра. У многіх з іх няма рабочага месца,—асабліва на кафедрах аналітычнай і арганічнай хіміі, дзе, напрыклад, у аспірантак Вечар і Каруннай абсталяванне рабочых месц цягнулася больш, як шэсць месяцаў. Не ва ўсім вырашана пытанне матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння аспірантаў пасудай, рэактывамі і прыборамі. Так, некаторыя аспіранты вымушаны купляць неабходныя для сябе інструменты і рэактывы за свой кошт, як гэта зрабіла, напрыклад, аспірантка Фалдзіна. Многім прыходзіцца набываць рэактывы і такім шляхам. Аспірант Шэдаў хацеў дастаць іх праз свайго кіраўніка прафесара Б. В. Ярафеева, які працаваў у Акадэміі навук БССР. Але прафесар у даны момант не працуе ў Акадэміі, таму аспіранту катэгарычна адмовілі даць там патрэбныя рэактывы. Чаму ж так атрымліваецца?

Ва універсітэце не вырашана пытанне аб куплі пасуды і прыбораў аспірантамі за наяўны разлік. Як правіла, дастаць грошы для куплі рэактываў, пасуды і прыбораў аспірантам вельмі цяжка.

Больш таго, на факультэце няма патрэбных прыбораў для хімічных аналізаў (спектрафатаметраў, храматографаў, электронных мікраскопаў). Таму прыходзіцца праводзіць аналізы на другіх факультэтах універсітэта і часцей за ўсё ў Акадэміі навук БССР. Гэта прыводзіць да значных затрымак у правядзенні аналізаў. Але гэта яшчэ паўбяды. Бываюць выпадкі, калі правесці той ці іншы аналіз не ўдаецца нідзе наогул. Няхват лабараторнай базы ўвогуле прымушае нашых аспірантаў скарачаць аналізы да мінімума. Гэта, вядома, адмоўна ўплывае на выкананне таго ці іншага даследавання.

У сувязі з гэтым зацягваецца і тэрмін абароны. У аспірантаў прафесара М. М. Паўлючэнкі і Б. В. Ярафеева з абаронай зацягваецца да васьмі год. У той час, як у Маскве нашы выхаванцы абараняюцца за тры-чатыры гады. Лік аспірантаў на факультэце з кожным годам узрастае, а навуковая і матэрыяльна-тэхнічная база факультэта не павялічваецца.

Зыходзячы з усяго гэтага, група народнага кантролю лічыць, што да ўвода ў дзеянне новага хімічнага корпуса не мэтазгодна павялічваць набор аспірантаў на хімфак. Неадкладна трэба таксама забяспечыць факультэт неабходнымі прыборамі, пасудай, рэактывамі.

**П. А. КЛІМОЎСКІ,**
**старшыня групы народнага кантролю хімічнага факультэта.**

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні тав. ГАХАВА Ф. Д.**

ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР

ЗА МНОГАГАДОВУЮ ПЛЁННУЮ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ І Ў СУВЯЗІ З ШАСЦІДЗЕСЯЦІГОДДЗЕМ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЎЗНАГАРОДЗІЦЬ ЗАГАДЧЫКА КАФЕДРЫ МАТЭМАТЫЧНАГА АНАЛІЗА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ТАВ. **ГАХАВА** ФЁДАРА ДЗМІТРЫЕВІЧА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**В. КАЗЛОЎ.**

**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР**
**Д. ЛУКАШЭВІЧ.**

# ЗВАННЕ КАМУНІСТА АБАВЯЗВАЕ

(Заканчэнне).

вае ведамі, асабістым прыкладам, партыйнымі адносінамі да свайго галоўнага абавязку яны выхоўваюць студэнтаў групы, курса.

Але было б неправільна меркаваць, што ва ўсіх студэнцкіх групах усё ідзе добра. Мы лічым галоўнай слабасцю нашай выхаваўчай і вучэбнай работы іменна тое, што не заўсёды камуністы з'яўляюцца прыкладам для студэнтаў. Вядома, што не могуць падаваць яго тыя дзесяць працэнтаў, якія ў час сесіі атрымалі «нездавальняюча». Прычым, некаторыя камуністы атрымалі іх па такіх дысцыплінах, як гісторыя КПСС, марксісцка-ленінская філасофія. Мы не можам дапусціць, каб наш універсітэт выпускаў сярэдніх спецыялістаў. Вучоба — гэта праца, праца настойлівая і паўсядзённая і толькі яна можа прынесці добрыя поспехі. Для непаспяваючых камуністаў няма ніякага апраўдання! Хіба можам мы праходзіць міма таго, што камуніст кепска вучыцца! Безумоўна, не.

Мы ўпэўнены ў тым, што ў далейшым камуністы — студэнты нашага універсітэта стануць у авангардзе шматтысячнай арміі студэнцтва, сваім асабістым прыкладам пакажуць, як трэба змагацца за веды, за выдатныя паводзіны ў побыце, дапамогуць выкладчыцкаму калектыву выхоўваць высокакваліфікаваных спецыялістаў.

* * *

У гарачых спрэчках, якія разгарнуліся пасля даклада, выступіла шмат студэнтаў-камуністаў. Вялічка (II курс аддзялення журналістыкі) падкрэсліў, што камуністы філалагічнага факультэта сталі ў авангардзе спаборніцтва за лепшы курс, групу ў гонар 50-годдзя Савецкай улады.

На юрыдычным факультэце, — гаварыў камуніст Абрамовіч, — амаль усе студэнты з вытворчасці. У іх вялікі перарыў у вучобе. Нам неабходна ў самы кароткі тэрмін арганізаваць дапамогу падобным студэнтам.

— Трэба разглядаць як персанальныя справы паводзіны тых камуністаў, якія атрымалі ў час зімовай сесіі двойкі, — адзначыў у сваім выступленні камуніст юрыдычнага факультэта Пружанскі.

Ніводнай «нездавальняючай»! — такім быў асноўны тон выступаючых. — Каб словы не разыходзіліся са справамі! Быць камуністам прыкладам ва ўсім — у вучобе і побыце! — Гэтымі словамі былі выказаны думкі і пачуцці кожнага, хто быў на партсходзе.



# НАСУСТРАЧ ПЯТАЙ УСЕСАЮЗНАЙ

* *

## НАШЫ МАГЧЫМАСЦІ, НАШЫ ЗАДАЧЫ

Закончыўся 1965 год. Ён быў годам далейшага росту спартыўнага майстэрства студэнтаў нашага універсітэта. У калектыве за гэты час падрыхтавана шэсць майстроў спорту, дваццаць кандыдатаў у майстры, пяцьдзесят чатыры спартсмены першага разраду і тысяча пяцьдзесят пяць другога і трэцяга.

Вялікая ўвага была ўдзелена падрыхтоўцы грамадскіх фізкультурных кадраў. Больш як пяцьсот пяцьдзесят студэнтаў універсітэта атрымалі званне інструктараў ці суддзяў па аднаму з дваццаці чатырох відаў спорту, якія практыкуюцца ва універсітэце.

Прыкметнага росту спартыўных вынікаў дабіліся зборныя каманды, удзельнічаючы на гарадскіх, рэспубліканскіх і Усесаюзных спаборніцтвах.

Нашы лёгкаатлеты, плыўцы, а таксама жаночая каманда па спартыўнай гімнастыцы перамаглі ў рэспубліканскай спартакіядзе і атрымалі пачэснае права абараняць гонар нашай рэспублікі ў фінале 8-ай Усесаюзнай спартакіяды прафсаюзаў у Маскве. Многія спартсмены універсітэта, якія выступалі на III Беларускай спартакіядзе прафсаюзаў, занялі прызавыя месцы, а такія майстры спорту, як Ліда Рулёва, Уладзімір Бандарэнка, Яўген Ямяльянаў. Таццяна Філонава і кандыдат у майстры Юра Гарадзецкі, сталі чэмпіёнамі гэтай спартакіяды. У склад зборных каманд рэспублікі было ўключана дваццаць тры студэнты універсітэта.

Каманды, якія выступілі ў Маскве па спартыўнай гімнастыцы і плаванню, занялі шостае месца, а лёгкаатлеты — сёмае.

Многае зроблена ў мінулым годзе, але сёлета перад намі задачы яшчэ больш складаныя. У фінал летніх спартыўных студэнцкіх гульняў уключаны спаборніцтвы па дваццаці відах спорту. У адрозненне ад мінулых студэнцкіх спартакіяд на гэты раз прымуць удзел не зборныя каманды спартыўных клубаў вну, а зборныя каманды студэнтаў рэспублікі, і толькі па такіх відах спорту, як валейбол, баскетбол, ручны мяч, воднае пола, настольны тэніс і шахматы, выступяць каманды спартыўных клубаў, якія выйдуць пераможцамі ў рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Рэктарат, кафедра фізічнага выхаваня і спорту, а таксама спартыўны клуб намецілі шэраг мерапрыемстваў для паспяховай падрыхтоўкі нашага універсітэта да чарговых спаборніцтваў. Гэтае пытанне падрабязна абмяркоўвалася на кафедры фізічнага выхавання і спартыўнага клуба. Складзены планы падрыхтоўкі зборных каманд універсітэта, праведзены агульныя сходы спартсменаў. Кожны з іх мае зараз індывідуальнае заданне, паляпшае сваё асабістае спартыўнае майстэрства.

Для паспяховай падрыхтоўкі каманд праводзіцца шмат збораў і таварысцкіх сустрэч са спартсменамі вну іншых рэспублік.

Кафедрай і спартыўным клубам у гэтым навучальным годзе праводзіцца XIV Агульнауніверсітэцкая спартакіяда па дваццаці трох відах спорту. У ёй прыме ўдзел больш чатырох тысяч студэнтаў. Гэта дасць магчымасць праверыць свае сілы і агульную падрыхтаванасць.

Дзесятага мая мінулага года рэктарат прыняў пастанову, якая накіравана на палепшанне ўсёй спартыўна-масавай работы сярод студэнтаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта, на падрыхтоўку зборных каманд да V Усесаюзнай летняй студэнцкай спартакіяды. Асаблівую ўвагу рэктарат звяртаў на стварэнне спартыўнай базы ва універсітэце. У бліжэйшы час нашы спартсмены атрымаюць вялікую залу памерам 29 на 16 метраў і залу 11 на 8 метраў. Будзе арганізаваны таксама асобны кабінет лячэбнай фізкультуры.

Спартсмены універсітэта зараз на ўсю рыхтуюцца да V Усесаюзнай студэнцкай спартакіяды. Асабліва трэба адзначыць нашых майстроў спорту па плаванню Л. Дзегцярова, У. Бандарэнку, Н. Садыкаву, па гімнастыцы Л. Рулеву, Р. Чэхаву, Н. Крыжэвіч, па фехтаванні М. Ліфшыца, Л. Мурзіну, па веласпорту З. Калацкую, В. Луцкіна, па лёгкай атлетыцы З. Давыдчык і многіх іншых спартсменаў, якія шмат працуюць для паспяховага выступлення на будучых спаборніцтвах.

Нашы жаночыя каманды па баскетболу, валейболу і ручному мячу таксама з'яўляюцца асноўнымі прэтэндэнтамі на ўдзел у фінале V Усесаюзнай спартакіяды. Мы спадзяемся на іх поспех.

Спалучыць добрую вучобу з паспяховай падрыхтоўкай да V Усесаюзных летніх спаборніцтваў — вось задачы першачарговай важнасці, якая стаіць зараз перад студэнтамі-спартсменамі універсітэта.

Рыхтуючыся да V Усесаюзнай студэнцкай спартакіяды наш калектыў прыняў павышанае абавязацельства па падрыхтоўцы спартсменаў-разраднікаў. Намечана падрыхтаваць у 1966 годзе сем майстроў спорту, дваццаць пяць кандыдатаў у майстры, семдзесят спартсменаў першага разраду і тысячу дзвесце спартсменаў другога і трэцяга.

Можна з упэўненасцю сказаць, што спартсмены універсітэта паспяхова справяцца з тымі задачамі, якія стаяць перад імі.

**В. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**

## Волаты-штангісты



Амаль кожны дзень пасля напружанай вучобы ў спартыўнай зале хімічнага корпуса трэніруюцца волаты нашага універсітэта — штангісты. Іх нямнога. Але поспехі-радуюць. І гэта, відаць, таму што трэніроўкі праводзіць вопытны педагог — трэнер В. Ф. Кавалёў.

*На здымку: чэмпіён «Буравесніка» Юра Гігіняк у час трэніроўкі.*

**Ю. ЧАРНЯКОЎ,**
**фота і тэкст аўтара.**

## КАНЬКІ

Праз тоўшчу зімовых воблакаў прабілася сонца. Яно бліснула па бегавых дарожках, адбілася на момант у адточаных коньках спартсменаў. На лёдзе — прадстаўнікі ўсіх факультэтаў, акрамя хімічнага. Усе прыйшлі з жаданнем перамагчы. Тут і першакурснікі і ўжо бывалыя бягуны.

Забег пачынаюць дзяўчаты. Дыстанцыя — 500 метраў. Стартуюць Ібашава і Зайцава — гістфак, Бяляева — філфак, Корзіна — фізфак і Максіменка — матфак.

## ЛЮБЯЦЬ

Пасля першых ста метраў уперад вырываецца Бяляева, Корзіна і Максіменка паказваюць з ёю аднолькавы час. На дыстанцыі 1 500 метраў лепшы вынік паказала Ліля Бяляева.

Не паспелі адзвінець канькамі дзяўчаты, стартуюць хлопцы. Дыстанцыя 500 і 3 000 метраў. Паміж мужчынамі разгараецца ўпартая барацьба. Малады спартсмен Гігіевіч паказвае лепшы вынік, апярэдзіўшы вопытнага бягуна студэнта фізічнага факультэта Рудніка. Гігіевіч быў першым і на дыстанцыі 3 000 метраў. Трэба адзначыць выступленне студэнта — журналіста першага курса Здановіча. Найбольш удала на спаборніцтвах выступілі Будай і Пушкін — філфак, Ларын — фізфак.

## УСЕ

Лёдавае спаборніцтва прайшло арганізавана, што сведчыць аб яго добрай падрыхтоўцы, аб любві нашых студэнтаў да канькоў.

**А. СЛУКА.**

## ПЕРАМАГЛІ МАЦНЕЙШЫЯ

Нядаўна ў спартыўнай зале галоўнага корпуса адбыўся матч дружбы па баскетболу паміж камандамі «Звейніекс» (Ліепая) і зборнай універсітэта. Ігра адразу ж зацікавіла. Перавага была амаль увесь час на баку беларускіх спартсменак. Толькі на трыццаць восьмай хвіліне гасцям удалося адыграцца і параўнаць лік. 39:39. Але пасля атакі з далёкай дыстанцыі баскетбалісткі Ніны Малашонак нашы дзяўчаты зноў вырваліся наперад. У апошнія дзесяць хвілін лік павялічваецца яшчэ на два ачкі. А пасля яшчэ. Перамога — 43:39.

Гэта вялікі поспех нашай каманды, таму што супернік быў сур'ёзны.

Дарэчы, у мінулагоднюю сустрэчу на першынства Савецкага Саюза ў класе «Б» у горадзе Клайпеда здарыўся аналагічны выпадак. На апошніх хвілінах сустрэчы Ніна Малашонак прынесла камандзе чатыры пераможныя ачкі.

— Шчаслівы ігрок для вашай каманды, — прыкмеціў старшы трэнер «Звейніекс», — другі раз Ніна падрыхтавала для нас адзін і той жа сюрпрыз і абое разы не ў нашу карысць...

Паўторны матч прайшоў у больш спакойным тэмпе, без асаблівых сітуацый. Вынік сустрэчы 40:35 у карысць каманды нашага універсітэта.

Коратка аб камандзе гасцей. Гэта другі прызёр Латвіі, зборная горада Ліепая. Яна займае лідыруючае месца ў турнірнай табліцы першынства рэспублікі.

**Т. ЯКАЎЛЕВА,**
**член зборнай па баскетболу.**

Зіма.

*Фотаэцюд А. КАДЗЕТА.*

## УВАГА! УВАГА!

26 ЛЮТАГА, АКТАВАЯ ЗАЛА ФІЛФАКА, 19 ГАДЗІН 30 МІН.

ВЕРШЫ УЗЛЁТАЎЦАЎ, ПЕСНІ, МУЗЫКА, ІГРАЕ АРКЕСТР. У КІЁСКУ — «УЗЛЁТ», КНІГІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ, ЯКІЯ БУДУЦЬ НАШЫМІ ГАСЦЯМІ.

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА ФІЛФАКА, БЮРО ЛІТАБ'ЯДНАННЯ «УЗЛЁТ».**

**Рэдактар А. ЛОЙКА.**

АТ 00783. Адрас рэдакцыі: г. Мінск. БДУ імя Ул. І. Леніна, галоўны корпус, п. 212, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 371.